# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Надыходзіць перыяд, калі можна не думаць пра кар'ерныя дасягненні і прафесійны ўзровень і прысвяціць больш часу асабістаму і сямейнаму жыццю. У аўторак праявіце рашучасць і актыўнасць, тады добра адзначыце галоўную ноч у годзе. Зоркі абяцаюць, што вы знойдзеце пад ёлкай нямала прыемных сюрпрызаў.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні паспрабуйце атрымаць ад жыцця задавальненне, будзьце добразычлівыя і адкрытыя для новых знаёмстваў. Скончыўся перыяд сварак з партнёрамі, цяпер вашай задачай будзе ісці насустрач адно аднаму, працаваць над адносінамі. Не купляйцеся на шчодрыя абяцанкі, і тады апынецеся ў выйгрышы. У другой палове тыдня ёсць магчымасць клопатаў і перажыванняў, звязаных з праблемамі сяброў.

**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні ўсе перашкоды або абмежаванні на вашым шляху проста знікнуць. Дзейнічайце, рухайцеся наперад. Вы зможаце сустрэць Новы год менавіта так, як марылі: у вясёлай кампаніі прыемных людзей. І атрымаеце нямала падарункаў ад лёсу. Вы будзеце ў выдатным настроі, адчуеце гармонію з сабой і з светам. Усе праблемы застануцца ў мінулым годзе.

**РАК.** Пачатак тыдня пройдзе ў клопатах па падрыхтоўцы да свята. Упарадкуйце свае дзеянні, выдаткаваўшы пэўны час на планаванне, і вам удасца справіцца з усім без мітусні і спазнення. Вы атрымаеце патрэбны вынік, што адаб'ецца на вашым настрої і ўмацуе ваш аўтарытэт сярод навакольных. Ёсць імавернасць сустрэць Новы год у шумнай кампаніі і ў незвычайным месцы.

**ЛЕЎ.** Тыдзень спрыяльны для наладжвання важных дзелавых і сяброўскіх сувязяў. У святочнай, нефармальнай абстаноўцы вы можаце знайсці новую работу або спонсара. Не выключана, што частку ўвагі давядзецца пераключыць на рашэнне праблем людзей, якія залежаць ад вас. Але гэтыя намаганні акупяцца. Можаце разлічваць на дапамогу сяброў. У суботу паступіць доўгачаканая інфармацыя, якая, хутчэй за ўсё, пацешыць і дасць новыя магчымасці для самаўдасканалення.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні воля, энергія і шчаслівы выпадак могуць апынуцца ў адной запрэжцы і прыкметна прасунуць вас наперад. Але не паддавайцеся спакусе разлічваць выключна на шанцаванне — старанна плануйце свае справы, і вы дасягнеце намечаных мэт. Навагодняя ноч пройдзе нестандартна, будзьце гатовыя да ўсяго.

**ШАЛІ.** Паспрабуйце на гэтым тыдні не паддавацца на спакусы і правакацыі. Лепш загадзя азначыць лінію сваіх паводзін і прытрымлівацца яе што б там ні стала. Ні з кім не сварыцеся, асабліва за святочным сталом. Лепш менш гаварыць, інакш нагаворыце лішняга. У чацвер і пятніцу сходзіце ў госці да родных ці сяброў. Магчымыя добрыя навіны, перспектыўныя прапановы.

**СКАРПІЁН.** Вас чакаюць прыбыткі і поспех у справах. Толькі лепш не прымаць паспешлівых рашэнняў, неабходна ўсё старанна прадумаць і аб'ектыўна ацаніць. Новы год прынясе поспех і моцныя пачуцці, што зменіць ваша жыццё ў лепшы бок. У выхадныя з'явіцца магчымасць завяршыць назапашаныя хатнія справы. Паспрабуйце быць больш уважлівымі ў адносінах да блізкіх людзей.

**СТРАЛЕЦ.** Пачатак тыдня спрыяльны для кар'еры і вырашэння важных спраў. У панядзелак пажадана не ўпарціцца, адстойваючы свой аўтарытэт і кампетэнтнасць, а прыслухацца да мудрых і своечасовых парад, бо вы ад гэтага толькі выйграеце. У навагоднюю ноч надасца магчымасць бліснуць у гасцях сваёй эрудыцыяй, атрымаеце шмат тэлефонных званкоў і прыемных сюрпрызаў. Другую палову тыдня пажадана прысвяціць адпачынку. У суботу магчыма сур'ёзная размова са сваякамі — праявіце тактоўнасць і не апярэджвайце падзеі.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні вам будзе проста неабходна ўраўнаважыць свае і грамадскія інтарэсы. Пашырце кола зносін, запрасіце на свята сяброў і сяброў сяброў. У пачатку тыдня важная актыўнасць у любых дзеяннях, такім чынам вы падрыхтуеце трамплін для паспяховых пачынанняў. На сераду і чацвер не варта планаваць нічога сур'ёзнага. Адпачніце і выспіцеся пасля навагодняй ночы.

**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні важна пагадзіцца з тым, што любая выпушчаная дробязь можа прывесці да непрадказальных наступстваў. Каб быць на вышыні, вам неабходна прадумаць усё: як вы будзеце гаварыць, рухацца, які ў вас імідж. А вось з рызыкоўнымі дзеяннямі пажадана пачакаць. Ваша актыўнасць будзе выніковая, толькі не бярыце ўсё на сябе, парайцеся з сям'ёй, разам вырашыце, як лепш правесці святы. Канец тыдня прысвяціце аднаўленню сіл пасля чарады вечарынак.

**РЫБЫ.** На гэтым тыдні паспрабуйце злавіць сваю хвалю, а не падладжвацца пад іншых, хоць вам пакуль і не варта моцна вылучацца на фоне калектыву. Асаблівых дасягненняў на рабоце не прадбачыцца, усе заняты чаканнем свята. Каб з чацвярга да нядзелі ў доме не склалася гнятлівая абстаноўка, ад вас асабіста спатрэбіцца максімум такту і дабрыні. У нядзелю атрымаецца вырашыць большую частку набалелых хатніх праблем.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.53 | 7.25 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.35 | 7.10 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.43 | 7.25 |
| Гомель — | 9.06 | 16.48 | 7.42 |
| Гродна — | 9.42 | 17.10 | 7.28 |
| Брэст — | 9.34 | 17.19 | 7.45 |

### Месяц

*Апошняя квадра 19 снежня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

*Пр. Калініка, Мікалая, Філімона.*
*К. Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**27 СНЕЖНЯ**

У краіне

**1919** год — нарадзілася Галіна Кліменцьеўна Макарава, актрыса, народная артыстка Беларусі (1967), СССР (1980). У 1938 годзе скончыла студыю Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, працавала ў ім. Стварыла галерэю каларытных вобразаў жанчын з народа. Яркі самабытны талент актрысы найбольш поўна раскрыўся ў нацыянальным рэпертуары. Здымалася ў кіна- і тэлестужках «Удовы», «Цягнік смерці падрываць нельга», «Час выбраў нас». Памерла ў 1993 годзе.



**1949** год — нарадзілася Людміла Васілеўна Забалоцкая, беларуская паэтка. Працавала ў выдавецтве «БелСЭ», на Беларускім тэлебачанні, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Пралеска», у выдавецтве «Полымя», у часопісе «Адукацыя і выхаванне». Аўтар паэтычных зборнікаў «Сакавік», «Свята палыну», «Струны памяці» і іншых. Пераклала на беларускую мову раман Вальтэра Скота «Айвенга».

**1949** год — нарадзілася Святлана Лаўрэнцьеўна Лясун, беларуская баяністка, педагог, заслужаная артыстка Беларусі (1987), народная артыстка Беларусі (2001).

**1974** год — уведзена ў эксплуатацыю першая чарга Вілейска-Мінскай воднай сістэмы — Вілейскае вадасховішча (найбуйнейшы штучны вадаём Беларусі) і галоўны гідравузел. У гэты ж дзень здадзены ў эксплуатацыю электрыфікаваны ўчастак Беларускай чыгункі Мінск — Барысаў.

**1979** год — завершана электрыфікацыя чыгуначнага ўчастка Орша — Вязьма.

**1984** год — створаны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Лебядзіны».

У свеце

**1904** год — у Дубліне адкрыўся новы тэатр The Abbey Theatre. Ён стаў першым тэатрам у свеце, які ўтрымліваўся на дзяржаўныя датацыі.

**1929** год — у сваім выступленні на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў Іосіф Сталін абвясціў аб пераходзе да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа.

**1932** год — у СССР уведзена пашпартная сістэма. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пашпарты ўнутры краіны былі адменены. З іх адраджэннем паўстаў і інстытут прапіскі. Парушэнне парадку пашпартнай сістэмы з гэтага часу магло мець наступствам прыцягненне да адміністрацыйнай і нават крымінальнай адказнасці.



**1934** год — нарадзіўся Мікалай Аляксеевіч Слічэнка, расійскі спявак, акцёр, рэжысёр, мастацкі кіраўнік Маскоўскага музычна-драматычнага цыганскага тэатра «Рамэн», народны артыст СССР (1981). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1987).

**1939** год — нарадзіўся Эмануіл Гедэонавіч Вітарган, расійскі акцёр тэатра і кіно, рэжысёр, народны артыст Расіі. Здымаўся ў фільмах «І гэта ўсё пра яго», «Чарадзеі», «Місія ў Кабуле» і іншых.

## УСМІХНЕМСЯ

**Што нашаму чалавеку добра, тое раніцай дрэнна.**

— Дзяўчына, гэта не вы ўчора на карпаратыве танцавалі ў адной ніжняй бялізне?

— Я? У ніжняй бялізне? Вы, напэўна, рана сышлі.

**Памятаеце гісторыю, калі Ісландыя прапаноўвала 5000 еўра ў месяц мужчынам, якія прыедуць і будуць жаніцца з мясцовымі дзяўчынамі? Дык вось, я адпраўляў сваю анкету, і мне нядаўна прыйшоў адказ. Аказваецца, ісландкі самі прапанавалі ўраду 5000 еўра, абы я толькі не прыязджаў.**

— На якім тэрміне вы адчулі вярушэнне дзіцяці?

— Калі яно ўладкавалася на работу і стала жыць асобна.




caricatura.ru


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4276.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12